

Жыве Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№9 (1026) 13 студзеня 1995 г. Пятніца. | Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. | Тыраж 541972 экз. | Кошт у розніцу — 100 руб.



*ФАКТЫ*АРГУМЕНТЫ*КОММЕНТАРИИ*СОБЫТИЯ*

Вкратце

Минувшей ночью столица Чечни Грозный бомбардировке с воздуха не подвергалась, сообщил руководитель республиканской оперативной группы соседней с Чечней Ингушетии Адлоп Асканов.

По его данным, центр города, контролируемый чеченскими ополченцами, обстреливался из тяжелых орудий. По свидетельствам очевидцев, в Грозном идет снайперская война.

❑

В Чечню отправлены элитные части морской пехоты Северного, Тихоокеанского и Балтийского флотов, а также отряд "Витязь".

Как сообщили осведомленные военные источники, в ближайшие дни —"завтра-послезавтра" — следует ожидать нового, как полагает командование, решающего штурма Грозного.

❑

Два транспортных самолета ИЛ-76 с гуманитарной помощью для беженцев из Чечни прибыли 11 января в аэропорт Беслан в Северной Осетии.

Они доставили 50 тонн продуктов питания от Армии спасения и 9 тонн медикаментов от Всемирной конфедерации профсоюзов.

❑

Национальная валюта Казахстана — тенге, введенная в обращение в ноябре 1993 года, будет признана единственным законным платежным средством при наличных расчетах на территории республики с 16 января.

С этого дня будет запрещена розничная торговля, выполнение работ и оказание услуг за наличную иностранную валюту.

❑

Курс российского рубля по отношению к доллару США на торгах Московской межбанковской валютной биржи 12 января упал на 23 пункта по сравнению с торгами в среду и составил 3757 рублей.

Беларусь присоединилась к натовской программе

Республика Беларусь стала 24-й страной, которая присоединилась к натовской программе "Партнерство ради мира". 11 января в штаб-квартире НАТО в Брюсселе рамочный документ программы подписал министр иностранных дел нашей республики Владимир Сенько.

Перед церемонией подписания ПРМ В.Сенько встретился с генеральным секретарем НАТО В.Классом. В ходе беседы стороны обменялись мнениями о развитии международной ситуации, положении в странах СНГ и Республике Беларусь в частности. В.Класс высказал глубокую удовлетворенность тем, что новое руководство Республики Беларусь приняло решение о присоединении к программе ПРМ и тем самым проявило намерение внести свой вклад в строительство новой архитектуры общеевропейской безопасности. По его мнению, следующим шагом должна быть разработка индивидуальной программы между Беларусью и НАТО, конкретное содержание которой может быть определено в ходе дальнейшего переговорного процесса.

Будет недород — поможет кислород

Ставка на строительство мини-предприятий делается в колхозе имени Кирова Пинского района.

Здесь успешно работает кислородный завод, потребителями которого являются 152 предприятия и организации республики. За прошлый год чистый доход от производства кислорода составил почти 27 миллионов рублей. В хозяйстве функционирует также собственный цех по пошиву спецодежды, планируется запустить в работу цеха по переработке мяса, производству крупы, муки и сечки, мини-молокозавод и спиртзавод. В перспективе — строительство сахарного завода, сырье которому будут поставлять колхозы-соседи.

Михаил САВЧЕНКО.

Останемся без крахмала

Остановлено производство на всех четырех крахмальных заводах Гродненской области.

Причина — из последнего урожая на промпереработку было приобретено чуть больше 3000 тонн картофеля. Договоры заводов с колхозами не были выполнены из-за летней засухи. В результате предприятия поставлены на консервацию, а их трудовые коллективы остались без работы.

Александр СЕРГЕЕВ.

Музей выходит из бомжей

Наконец обрел надежную крышу Брестский краеведческий музей, несколько лет назад выселенный из возвращенного католикам костела.

Новым и окончательным пристанищем музея стало историческое здание в центре Бреста, восстановлением которого четыре года занимались строители-реставраторы. Пока подписан акт приемки объекта, а открытие первых экспозиций намечено на начало мая.

Василий САРЫЧЕВ.

Символы "вольных каменщиков"

Уникальное собрание символов и атрибутов масонства, а также литературы об этом религиозно-этическом движении, возникшем в Великобритании около 200 лет назад, выставлено в Витебском областном краеведческом музее.

Материалы об истории франкмасонов ("вольных каменщиков"), стремившихся путем нравственного самосовершенствования объединить человечество в братском союзе, накопил еще в прошлом веке замечательный витебский коллекционер Вацлав Федорович.

Сергей ДВИНСКИЙ.

агенцтва Графуова

Курсы обмена наличных валют в коммерческих банках на 12 января 1995.

тел./факс (0172) 325-105

НАИМЕНОВАНИЕ БАНКА	Доллар США		Немецкая марка		Российск. рубль		Телефоны для справок
	Покупка	Продажа	Покупка	Продажа	Покупка	Продажа	
1. КОМПЛЕКС-БАНК	11400*	11750	7410*	7640	2.413	2.81	067
2. БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК	11300*	11600	7345*	7540	2.40	2.80	267-022
3. БЕЛАРУСБАНК	11600 11700**	12120*	7538 7597**		2.71*	3.03*	239-250
4. БЕЛБИЗНЕСБАНК (гл.операц.управ)	11450*	11900*	7300*	7800*	2.60	3.00	067
5. НАРОДНЫЙ БАНК	11450*	11800	7450*	7660	2.65	2.86	238-610
6. ПРОФБАНК	11450*	11750	7150*	7500	2.70	3.00	239-344
7. СБЕРБАНК	11400	11700	7350	7600	2.45	2.68	067
8. ОЛИМП	11500 11615**	11840 11958**	7460 7535**	7556 7632**	2.65 2.76**	2.80 3.00**	508-556
9. ДУКАТ	11400*	11800	7300*	7600	2.50	3.00	201-063
10. СП ГУБИСС РЕСУРС	11200	11700	6900	7590	2.40	2.90	769-177
11. БЕЛБАЛТИЯ	11400	11850	7150	7550	2.70	2.90	207-625
12. "СОЛИД"	11400	11800	7250	7500	2.65	2.90	202-993 067
13. БЕЛБИЗНЕСБАНК (гор. дирекция	11400	11700	7300	7500	2.50	2.80	634-341
14. МИЛАВИЦА филиал АКБ ДУКАТ	11420*	11750	6980	7480	2.30	2.80	372-825
15. ф. п. "ИНТЕРКОНТИНЕНТАЛЬ"	11250	11700	7000	7400			293-187
16. ВЕЛЕС филиал АКБ ДУКАТ	11400	11700	7300	7600	2.60	3.00	
17. БЕЛИНВЕСТБАНК	11100	11600	7100	7600	2.30	3.00	
18. филиал № 1 банка ОЛИМП	11400 11514**	11750*	7300 7373**	7600*			291-646
19. ПОИСК	11100	11600	6900	7300	2.70	2.90	
20. ЕВРОПЕЙСКИЙ	11400 11650**	11750 11800**	7400 7550**	7650*	2.65 2.75**	2.85 3.00**	
21. МАГНАТБАНК ф-л 001	11350*	11700*	7150*	7500*	2.60	2.85*	
22. МИНСКИЙ ТРАНЗИТНЫЙ БАНК	11400 11605**	11730 12000**	7200 7400**	7530 7800**	2.45	2.80	

*-Возможна операция за наличный и безналичный расчет

**-Операция проводится только по безналичному расчету

Не заносите меч над свободой слова!

Острой тревогой за судьбу белорусской прессы продиктовано открытое письмо Международной конфедерации журналистских союзов Президенту страны Александру Лукашенко.

Скандальные "белые пятна", невыход газет, кадровые перетасовки в некоторых газетах, отлучение ряда изданий от полиграфической базы эта международная профессионально-творческая организация расценивает как наступление на свободу слова и права журналистов.

"Призываем Вас, уважаемый господин Президент, — говорится далее в письме, — остановить эскалацию наступления на свободное слово, задуматься о всех возможных последствиях, дать обратный ход, решить проблемы без репрессий и пережимов. Это будет правильно воспринято и журналистами, и обществом, будет воспринято не как Ваша слабость, а как мудрость, умение не усугублять ошибочные действия".

Кастусь АЛЕКСАНДРОВИЧ.

Москву все равно не умаслишь

С декабря прошлого года в Могилеве сливочное масло в магазинах реализуется по талонам — 200 граммов на человека, что, прямо скажем, не жирно. В то же время этот продукт буквально ящиками "уплывает" из города.

6 января в результате проверки поезда Могилев—Москва сотрудниками отдела по борьбе с экономической преступностью УВД Могилевского облисполкома и службы контроля администрации Президента было конфисковано у пассажиров 15 ящиков масла, или 300 килограммов, а на следующий день — еще 16 ящиков.

Александр АЛЕКСАНДРОВИЧ.

Хочу работать на хозяина!

Большинство жителей Бреста положительно оценивают изменения, вызванные процессом приватизации в городе.

Основные результаты опроса общественного мнения, проведенного по инициативе городских властей и Брестского независимого социально-психологического центра, таковы: более 85 % респондентов знали все или почти все приватизированные магазины в городе. Причину популярности вышедших из-под опеки государства предприятий торговли указали сами брестчане. 74 % опрошенных отметили расширение ассортимента товаров и услуг в этих торговых точках. 45 % заявили, что цены здесь ниже или соответствуют уровню цен в госмагазинах. Более половины опрошенных заявили о своем желании работать на приватизированных предприятиях.

Олег СУПРУНЮК.

Авторучка-пистолет может убить

В начале января первоклассник одной из барановичских школ нашел во дворе своего дома авторучку-пистолет промышленного производства.

Мальчик покрутил авторучку и — раздался выстрел. С диагнозом "проникающее огнестрельное ранение" он был доставлен в больницу. К счастью, ребенок остался жив.

Милиция ведет поиски неизвестного "Джеймса Бонда".

Игорь ПАЛЬМОВ.

Строительный пистолет уже убил

В трагической статистике Гродненщины появилось дело о самоубийстве с использованием... строительного пистолета.

Таким необычным образом решил расстаться с жизнью в канун Нового года 58-летний инженер-электрик монтажного треста. Самоубийство было совершено в собственной квартире. Мотивы его расследуются.

Александр СЕРГЕЕВ.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, БелаПАН, РИД.

На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Прэзідэнт не пажадаў, каб прэм'ер быў "хлопчыкам для біцця", і даў зразумець парламенту, што можа адклікаць урад з дыскусіі аб бюджэце

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

З кожным днём напружанасць у Авальнай зале нарастае, бо набліжаецца час, калі трэба будзе канчаткова вырашыцца: быць бюджэту ці не. Гэта значыць даць згоду ўнутранай палітыцы ці адмовіцца ад яе. Бюджэт — гэта на сённяшні дзень апошняе, што трэба Прэзідэнту ад парламента. Таму ўчора ён нават прыйшоў на паўгадзіны ў Вярхоўны Савет, каб заняць сваё месца ў зале, і выступіў з чарговай прамовай перад дэпутатамі. На гэты раз ультыматыўных нот у словах Прэзідэнта чуваць не было, ён амаль што прасіў прыняць бюджэт.

У доказ сваёй лаяльнасці Аляксандр Лукашэнка нават паабяцаў больш не крытыкаваць парламент і ўвогуле яго не чапаць. Але пры гэтым заўважыў, што не дазволіць рабіць з прэм'ер-міністра "хлопчыка для біцця". Урад не можа сядзець тут столькі дзён, запэўніў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, за першыя два тыдні гэтага года Беларусь не атрымала ніводнай тоны нафты і таму з заўтрашняга дня ўрад пачне працаваць над ажыццяўленнем гандлёва-эканамічнага пагаднення з Расіяй і дамовай з Узбекістанам.

Але сапраўды, чаму ж было не даць Прэзідэнту і ўраду гэты самы бюджэт? Вернемся да раніцы ўчарашняга дня. Справа ў тым, што напярэдадні, на вячэрнім пасяджэнні ў сераду, дэпутаты нечакана павялічылі ў бюджэце расходы на ахову здароўя амаль утрая — аж на 2 трыльёны рублёў. Гэта быў чалавечы водгук на надзвычайнае становішча ў нашых бальніцах і аптэках. Гэта быў крык душы.

Калі дабаўляць, дык трэба недзе браць. Дзе ж узяць аж два трыльёны рублёў? Пачалі шукаць тыя "чароўныя" крыніцы. Дэпутат Лявон Тарасенка прапанаваў на 20 працэнтаў скараціць ваенныя расходы, на столькі ж — фінансаванне органаў унутраных спраў і ўдвая — дзяржаўную бяспеку. Ягоную прапанову адхілілі, амаль не абмяркоўваючы. Потым пачаўся не столькі пошук крыніц, колькі прынцыповы аналіз становішча. Гэты аналіз прывёў да высновы: патрэбны дадатковыя слуханні, патрэбны дарадчая камісія, дэталёвае абмеркаванне канцэптуальных падыходаў да рэформ. Але, як заўсёды, жадаючых спыніцца і паразважаць было менш, чым жадаючых хутчэй вырашыць спрэчкі галасаваннем. Зноў пачаўся пошук злашчасных трыльёнаў.

Нарэшце адразу некалькі дэпутатаў прапанавалі ўзяць грошы з Расіі за карыстанне базамі на нашай тэрыторыі. Алег Трусаў быў тут найбольш паслядоўным: паводле дагавору з Расіяй, мы аддалі ў арэнду базы на 25 гадоў, нашу маёмасць назвалі не нашай ды яшчэ базы назвалі не базамі, а нейкімі вузламі.

Цікавы прыклад прывёў Станіслаў Шушкевіч. Казахстан ад Расіі атрымлівае за Байканур 170 мільёнаў долараў, база сачэння пад Баранавічамі — амаль такі ж па значэнню аб'ект — вось вам і 2 трыльёны грошай на медыцыну! Потым Уладзімір Сапронаў звярнуў увагу на ценявую эканоміку, нагадаўшы, што, паводле звестак экспертаў, амаль 2 мільярды долараў знаходзіцца ў насельніцтва ў кішэнях і гэтыя грошы ніяк не працуюць на карысць Радзімы.

"Бюджэт не адпавядае мэтам стварэння сапраўднай рыначнай эканомікі, — сцвярджаў Уладзімір Заблоцкі. — Наш Прэзідэнт, мяркуючы па апошнім выступленні ў Мінскім гарсавеце, і не абяцае, што сапраўдная рыначная эканоміка будзе стварацца. Бо ён супраць стварэння рынку нерухомасці, зямлі, а без гэтага сапраўднага рынку не бывае".

Далей адбылося нібы ў той казцы, дзе часта паўтараюць імя чараўніка. Пасля ранішняга перапынку ў зале раптам з'явіўся Аляксандр Лукашэнка і хутка ўзяў слова ў адказ. Вось кароткі канспект ягонай прамовы. Прэзідэнт казаў:

— аб **задзейнічанні 2 мільярдаў долараў насельніцтва**. Што, па-першае, гэта прыблізная лічба, ніхто яе не ведае. А па-другое, што пошукі, як задзейнічаць гэтыя грошы, ідуць. Праблема таксама ў салідным банку, якому грамадзяне давераць свае ўклады, бо ў нашы слабыя банкі наўрад ці хто панясе свае "даляры".

— аб скарачэнні расходаў на армію. Нашы сённяшнія расходы — гэта на 90 працэнтаў патрэбы на авіяцыйную тэхніку, паліва, запчасткі. А на сутачным утрыманні шмат не зэканоміш.

— аб скарачэнні расходаў МУС. Расце злачыннасць, патрэбна больш сродкаў на тэхнічнае ўзбраенне міліцыі — аб якім скарачэнні можна казаць?

— аб грашах за расійскія ваенныя базы. Так, Казахстан бярэ за Байканур 170 мільёнаў долараў. Але ж гэта дзеючы аб'ект. У той час як база пад Баранавічамі зроблена толькі на 70 працэнтаў. "Не атрымаеце вы ад яе нічога, калі б і хацелі".

— аб танных энерганосьбітах. Увесь Блізкі Усход аблазілі, шукаючы танную нафту. Знайшлі, але калі падлічыш разам з дастаўкай, то танней не атрымліваецца.

— аб стратах з-за транзіту. Пагадненне з Расіяй створана на аснове дамовы: вы нам меншыя цэны на энерганосьбіты, мы вам — безаплатны транзіт. Калі яны гэтага не будуць выконваць, дык і мы пераглядзім свае абяцанні. Але ўвогуле эканамічнае збліжэнне з Расіяй — гэта наша стратэгія, гэта перадвыбарная платформа Аляксандра Лукашэнкі.

...Вядома, што яшчэ не раз мы пачуем і жорсткую крытыку гэтых адказаў, і новы наступ Прэзідэнта на сваіх апанентаў. Бо на палітычнай вайне як на вайне. Але на той момант дыскусія як бы сціхла і пачаўся паступовы рух наперад шляхам галасавання. Адзін за адным "здаліся" артыкулы з 7-га па 12-ы. У "тыле" заставаліся толькі 1-ы — аб памеры дэфіцыту і 6-ы, які раскрываў расходную частку бюджэту. Але новыя два трыльёны ў даход так і не з'явіліся.

НЕ МАГУ МАЎЧАЦЬ

Чаму на дзецюкоў у форме АМАПа людзі глядзяць з такой насцярогай?

Для мяне ўсё свядомае жыццё было загадкай: чаму людзі ставяцца да работнікаў у форме АМАПа з насцярогай? У той жа час сродкі масавай інфармацыі і кіно даводзяць нам аб высокай культуры і шырокім прафесійным дыяпазоне паліцэйскіх заходніх краін — маўляў, і роды прымуць, калі трэба, і першую медыцынскую дапамогу акажуць, і...

Мае бацькі, сяляне, выхавалі мяне ў законапаслухмянстве, павазе да старэйшых, слабейшых. Сваім жыццём вучылі (а маці вучыць і зараз) з годнасцю бараніць "гонар беларуса і родную, потам палітую зямлю". А што ж у жыцці? 4 студзеня я атрымаў для сябе вычарпальны адказ на гэтае пытанне. У гэты дзень на пляцы Незалежнасці, за 30—40 метраў ад рэзідэнцыі Прэзідэнта, я быў з прымяненнем фізічнай сілы ў 12 гадзін схвачаны падпалкоўнікам у "воран", дастаўлены ў Маскоўскае РАУС, а ў 18 гадзін ужо сядзеў, як кажуць, у турме. Суд устанавіў, што я "оскорбил работника милиции, находящегося при исполнении служебных обязанностей по охране массовых мероприятий, оказывал неповиновение законному требованию работника милиции следовать в отделение милиции для разбирательства. При доставлении вырывался, кричал, падал на землю, упирался". Суд падверг мяне адміністрацыйнаму арышту тэрмінам на 5 сутак. Пасля суда я напісаў заяву на імя начальніка міліцыі і турмы аб тым, што ў знак пратэсту супраць беспрычыннага затрымання і арышту аб'явіў сухую галадоўку. Дзякуючы дзеянням грамадскасці мяне вызвалілі 6 студзеня. Мне пакуль што невядомы матывы вызвалення, але буду дамагацца адмены рашэння суда і кампенсацыі матэрыяльных і маральных страт.

Дзеля эканоміі газетнай плошчы і часу чытача ўмоўна дапусцім, што я заслужыў такога пакарання. Але ж навошта мяне, пенсіянера, было прапускаць праз прафесійныя амапаўскія "ласкі", у выніку якіх работнікі Маскоўскага РАУСа выклікалі "хуткую дапамогу" і ў суправаджэнні работніка міліцыі з папярэднім дыягназам чэрапна-мазгавой траўмы я быў дастаўлены ў бальніцу N 3? Хірург дакументальна засведчыў фізічныя пашкоджанні... У мяне сёння, 9 студзеня, яшчэ баляць рукі, грудзі, левая нага. Рукаў новай дублёнкі па-жывому аказаўся разарваны, адарваны канец дзягі. Дзеля чаго ўсё гэта трэба было рабіць асабіста начальніку штаба АМАПа Рэспублікі Беларусь падпалкоўніку Французаву (па ўзросту — мой сын) і падпарадкаваным яму шарагоўцам (па ўзросту — мае ўнукі)?

А было ўсё так. Прыйшоў я да адміністрацыі Прэзідэнта, каб атрымаць інфармацыю, чаму два тыдні не атрымаў па падпісцы газету "Свабода". Повадам для нападу на мяне было тое, што, ідучы дадому, я пачуў, як падпалкоўнік Французаў аддаваў загад па рацыі работнікам міліцыі пачаць правакацыйныя дзеянні супраць 20—30 падпісчыкаў газеты "Свабода" з мэтай выклікаць дзеянні ў адказ і тых, хто акажа "супраціўленне", 2—3 чалавекі, узяць у машыну. Я гэта чуў і бачыў, як пачалася таўкатня жанчын і міліцыянтаў. Не зрабіць заўвагу на правакацыйную каманду службовай дзяржаўнай асобы я не мог. І калі паўторыцца нешта падобнае, несправядлівае, амаральнае, я не застануся абыякавым. На сёмым дзесятку жыцця, упершыню прайшоўшы праз прафесійныя рукі і прыёмы АМАПа, міліцыі і камеру зняволення, знайшоў адказ на пытанне, якое вынесена ў загаловак артыкула. Пра нечалавечыя ўмовы ўтрымання зняволеных можна і трэба пісаць асобны артыкул.

Мікола САВІЦКІ,
прафесар, старшыня Мінскай гарадской рады Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны.

Визиты

Вчера в Минск прилетел Джордж Сорос, американский бизнесмен и меценат



Его фонды действуют более чем в двадцати странах мира. Более двух лет назад был организован Белорусский фонд Сороса, целью которого является содействие формированию и развитию открытого общества. За это короткое время у нас в республике был разработан и осуществлен ряд программ, в основном образовательного характера.

Так, например, в рамках программы "Трансформация гуманитарного образования" проведен конкурс по созданию новых школьных и вузовских учебников. Более семисот человек, которые стали победителями конкурса, проведенного Международным научным фондом, получили в рамках программы срочной помощи ученым по пятьсот долларов США. Семьдесят пять научных коллективов стали победителями конкурса по программе долгосрочной помощи ученым, каждый из которых получит по 10 тысяч долларов. Джорджем Соросом учреждены стипендии, которые были присуждены известным белорусским ученым.

Благодаря материальной помощи фонда сотни людей изучают английский язык, проходят курсы переподготовки, учатся за рубежом. Институт приватизации и менеджмента проводит большую работу по пропаганде экономических преобразований, делает анализ состояния народного хозяйства, организовывает международные семинары по актуальным экономическим проблемам.

Вчера Джордж Сорос встретился с Президентом Республики Беларусь Александром Лукашенко. Во время встречи, которая длилась более полутора часов, были обсуждены проблемы дальнейшего сотрудничества.

Состоялись также встречи с коллективом программы "Обновление гуманитарного образования", с членами наблюдательного совета.

Вечером Джордж Сорос провел пресс-конференцию, о которой мы расскажем в следующем номере нашей газеты.

Владимир САМОЙЛОВ.

❑ *Во время встречи Дж.Сороса с Президентом Республики Беларусь А.Лукашенко.*

ГОСЦІ РЭДАКЦЫІ

У Індыі шмат спаноў, але няма ніводнай урадавай газеты

Пра гэта і яшчэ шмат пра што цікавае распавёў у рэдакцыі "Народнай газеты" пасол Індыі на Беларусі пан Рамеш Чандра Шукла.

Заўчора ён упершыню завітаў у сталічны Дом друку, і прыемна, што бліжэйшае знаёмства з жыццём-быццём беларускай журналісцкай браціі вопытны дыпламат вырашыў пачаць менавіта з "Народнай газеты". Урэшце, пан пасол не толькі задаваў пытанні аб праблемах "чацвёртай улады" і ўвогуле палітычнага жыцця рэспублікі, але і сам паведаміў шмат цікавай інфармацыі пра індыйскі вопыт вырашэння аналагічных праблем. Высветлілася, у прыватнасці, што ў гэтай агромністай краіне няма ніводнага дзяржаўнага выдання, і ўлады з гэтай нагоды зусім не бядуюць...

У бліжэйшы час чытайце ў "Народнай газеце" грунтоўнае інтэрв'ю з панам Рамешам Чандрам Шуклам.

Аляксандр КЛАСКОЎСКІ,
Сяргей ГРЫЦ (фота).



Народная газета

ДОБРЫЕ ВЕСТИ

"Грайне" аплодировали в Швейцарии

"Грайне" в переводе с белорусского означает игрище, народное веселье. Таким ласковым словом назвал свой коллектив руководитель хора, выпускник белорусской консерватории Николай Кашуро. Репертуар хора составлен из произведений национального фольклора и белорусской духовной музыки.

Хор недавно отметил свое четырехлетие. Члены "Грайны" неоднократно выступали со своей программой перед зрителями, записались на радио и телевидении. В минувшем году коллектив был приглашен на 30-й международный хоровой фестиваль в Швейцарию.

В одном из престижных концертных залов в городе Монтре выступали 19 хоров из 15 стран мира. Представители Беларуси приехали на фестиваль впервые. Но хозяева и гости по достоинству оценили их выступление. Коллектив хора "Грайна" был награжден специальным призом и дипломом жюри с наивысшей оценкой.

Наталья АЛЕЙНИКОВА.

Обращение наблюдательного совета Белорусского фонда Сороса к бизнесменам Беларуси

В глубоком экономическом кризисе, в котором оказалась Беларусь, не следует пренебрегать помощью извне. Немалые средства Джорджа Сороса поддержали российскую науку, материально помогли многим ученым стран СНГ, в том числе и в нашей республике. Важно, что фонды Сороса спонсируют свежие оригинальные идеи в области фундаментальных наук, экологии, гуманитарных областях знаний — именно в тех сферах, на которые в постсоциалистических странах хронически не хватает средств, которые одновременно являются основой развития нации.

К сожалению, Беларусь — едва ли не единственная страна, где благотворительная деятельность господина Сороса была встречена с подозрением, проявлявшимся в необоснованной критике деятельности Фонда некоторыми средствами массовой информации. Отказ бывшего премьер-министра В.Кебича встретиться с Джорджем Соросом имел лишь те последствия, что финансирование наиболее дорогостоящих программ для Беларуси стало проблематичным.

Понимая важность деятельности Фонда Сороса в процессах наиболее эффективных социальных и экономических преобразований, мы в полной мере осознаем, что такие фонды не могут заменить государственных и других внутренних источников финансирования. Средства Сороса не бесконечны.

Мы призываем белорусских бизнесменов присоединиться к благотворительной деятельности Джорджа Сороса. Понимаем, что это — непростое решение для каждого бизнесмена, несущего бремя непосильных налогов. Объединяющим моментом должно стать создание нового законодательства, при котором благотворительность в республике станет сколь престижным, столь и выгодным делом.

Считаем, что это поможет не только оздоровить молодой белорусский бизнес, но и серьезно поддержать усилия государства по финансированию культуры, образования, средств массовой информации, экологии, специальных медицинских программ, фундаментальных наук. Не сомневаемся, что интуиция бизнесменов-спонсоров безошибочно выберет наиболее эффективные сферы для вложения средств.

Наблюдательный совет будет изыскивать возможности через государственные органы, наделенные правом законодательной инициативы, провести решение о снятии налогов с пожертвований. Совет совместно с правлением Фонда подготовит предложения по определению доли доходов, при перечислении которой в фонды благотворительности предприниматели получают налоговые льготы.

Поэтому обращаемся еще раз к тем из бизнесменов, кому дороги судьбы нашей страны, кто поддерживает идеи открытого общества с просьбой стать посильными финансовыми донорами и поддержать деятельность Белорусского фонда Сороса.

Наблюдательный совет Белорусского фонда Сороса.

Задумаемся!

Клевета — не аргумент

Появление не так давно в газете "Правда" статьи "Мама, возьми гадильник!", воплотившей в себе традиции стиля журналистики 1937 года, по правде говоря, не удивляет. Удивила ее перепечатка. Однако мы не собираемся осуждать корреспондента "Правды" Олега Степаненко и редакционные коллективы. Бог им судья.

Оставим на совести автора измышления о проведении "белорусизации с ярко выраженной антирусской направленностью", о попытках "националистов" "вбить клин между белорусами и россиянами", о воспитании "люто ненавидеть Россию" и о том, что "БНФ с Позняком во главе разжигали ненависть к России", а "Народная газета" печатает русофобские статьи и всех тех, кто осмелится возражать, обвиняет во всех смертных грехах, вплоть до "измены Родине", и что родители детей "боятся националистов-демократов", "шовинисты топчут Конституцию", а учебники насыщены выражениями типа "Беларусь чуть ли не постоянно воевала с Россией", "русский народ был самым страшным врагом" и о "кровавой вражде русских и белорусов".

Эти цитатки приведены не для того, чтоб вызвать сомнение у читателя в здравомыслии корр. "Правды", наоборот — считаем его вполне нормальным человеком. Он отстаивает свои интересы, вернее, интересы какой-то части населения, хотя и сомнительным способом — клеветой на вторую, основную часть населения. Забыв, что та, другая часть, также имеет свои интересы, а все в целом составляют (должны составлять) единую нацию — белорусский народ. Направить бы журналисту свои усилия на сплочение этих частей, а не на разжигание страстей!

Оставим в стороне надуманный автором статьи детский лепет про "гадильник" и этот, о ужас, "эксперимент на детях", в результате которого их калечат с первого класса преподаванием белорусского языка, из-за чего они заболевают. Дорогой читатель, давайте лучше вслушаемся и порассуждаем над речью взрослых в общественных местах города и деревни. Почему такой акцент и искажение слов (и русских и белорусских), не изувеченность ли это главной составной части белорусской культуры — ее языка? А почему так получилось? Не виной ли тому пресловутое двуязычие — плод бездарной политики слияния языков и национальностей? Язык является основой единства народа. Давайте проанализируем ситуацию. Когда же станет властвовать как объединяющий фактор язык коренного населения, название которого носит республика. При нынешней ситуации — никогда. Только неимоверными усилиями можно противостоять и не обрусеть, получив белорусский пронос, придя из белорусскоязычной среды (школы, вуза, училища) в русскоязычную нашей промышленности, учреждений. Подсчитайте, много ли таких одержимых в ваших коллективах? Кто их поддерживает, поощряет, чтоб они были.

Последним очагом хранителя, носителя языка была деревня. Что с ней стало, видите сами. Песни по каждому случаю, шутки-прибаутки, игры, танцы, легенды, мудрецы-старики, трезвость — где это все? А ведь все это было, было. Неужели это неумолимый ход истории? Не удалось пытка сравнять город с деревней, объединить "весь мир до основания" на идее коммунизма, выдвинута, вернее, вытянута из замшелых имперских портфелей новая — славянская. А основа ее та же — т.е. ассимиляция, слияние в единый уже не советский, а славянский народ с единым языком. Если это не так, то всякие здешние славянские соборы должны бы в первую очередь, по идее, поддержать борьбу за чистоту белорусского языка, национальное возрождение. Ибо то, что в высшей степени национально, становится в итоге интернациональным. Стоит ли эту простую истину объяснять нашему вскормленному на белорусских хлебах Сергееву из Славянского собора, приведенного корр. "Правды" в статье. Их стремление ассимилировать славянина-белоруса суррогатом русской культуры национализмом не считается. Парадокс.

Задумайтесь, сограждане, почему так случилось, что к 1980 году в местечках и городах Беларуси не стало ни одной белорусской школы. В одночасье прекратилось делопроизводство, преподавание в вузах, техникумах, училищах на родном языке. Почему? Может, об этом тоже не вспоминать, ибо Сергеев и в этом узреет разжигание ненависти к России. Почему шумят о каком-то насилии? В законах об образовании, о языках, о гражданстве вы его не найдете. Все они соответствуют международным правовым нормам. Есть только стремление, план — возродить утраченное, вернуть исконно свое. Вчитайтесь повнимательнее в эти законы — и вы убедитесь и, более того, заметите, что в них заложен фундамент двуязычия. Так почему же вместо возвращения белорусскоязычных школ, вузов, училищ стремятся навязать референдум о двуязычии? А ведь при введении двуязычия увеличатся вдвое и затраты. Считал ли кто, во сколько это обойдется? Все сознательные люди прекрасно понимают, что решать языковые вопросы простым голосованием, референдумом для белорусского народа неэтично, кощунственно. Ясно почему. Этому должна воспротивиться вся сознательная общественность, в том числе и мировая.

Беларусь в русскоязычной оккупации. Идет борьба за удержание этих позиций, втравливая в нее не только взрослых, не осознавших себя белорусами, но и их детей. А ведь разговор-то, заметьте, в подобных статьях не о культуре русского населения в Беларуси, его коренного населения, а о проблеме русского языка, которая фактически решена. Правда, решили ее, забив клин между белорусскоязычным и русскоязычным населением, диктаторски придав русскому языку статус языка межнационального общения. Призадумайтесь, почему белорусскоязычный белорус должен перейти на русский язык при общении со своим согражданином лишь потому, что тот не выполняет Закона о гражданстве. Не желает знать, понимать язык коренного населения в рамках общения. Это по отношению к белорусу насилием не является, а вот проявить насилие над собой, чтобы выучить язык, кто-то считает страшным насилием. Парадокс. Зададимся вопросом: можно ли вообще достичь цели без определенного насилия? Насилие насилию рознь. Гуманное проявление насилия над собой — уступить ближнему, чтобы достичь согласия. Кто попробовал разъяснить возмутившимся родителям необходимость обучения детей с первого класса по-белорусски? Кто показал, что этих детей в противном случае ждет такая же языковая неопределенность, как и их родителей? Мы не хотим, чтобы дети наших детей "грызлись" с новоявленными степаненками, борисюками, тарасевичами за отстаивание своих языковых интересов, отвоевывая себе родную языковую среду. Мы хотим общественного согласия, развития своей национальной, а не какой-то интернациональной культуры. У нас нет второй Родины с белорусскоязыковой средой. Нам некуда выехать. И мы не хотим очередной волны эмиграции.

Мы вынуждены взяться за перо, чтобы достучаться до сердец родителей, которые, помилуй их Бог, не осознают, что делают, устраивая так называемые "забастовки первоклашек".

В голодные годы, чтобы подольше хватило кормов скотине, белорусские крестьяне в сено подтрясали соломы. Эту смесь они называли "трасянкай". Приведенный "правдистом" Степаненко в статье перевод "трясучка" звучит издевательски, совершенно не соответствуя понятию. Простим ему эту "неточность" и посоветуем, прежде чем писать, заглядывать в словарь.

Мы не скотина и также против безграмотности — языковой "трасянки", но при первых шагах, как в голодный год, ее не минешь, пережить надо.

Николай ЛАВИЦКИЙ,
заместитель начальника отдела охраны труда Минского автозавода, председатель совета товарищества белорусского языка им. Ф.Скорины Заводского района г.Минска.

Борис РОДИЧ,
старший мастер МАЗа, член центрального совета Белорусской социал-демократической Громады, член совета товарищества белорусского языка Заводского района.

P.S. Эту статью мы предложили той русскоязычной газете, которая поспешила перепечатать публикацию в "Правде". К сожалению, наше мнение было отправлено ... в архив. Поэтому без перевода предложили ее "Народной газете".

ПРА ГЭТА ЯШЧЭ НЕ ПІСАЛІ

"Хімія" — не турма, але і не воля

Віктар ХАРОШКА

Ёсць людзі, якія пераступілі закон па волі выпадку. Ці, па-іншаму, злачынцамі сталі ў асноўным па незалежных ад іх прычынах. Іх што, за краты? Не — гаворыць закон. І дае магчымасць адбываць пакаранне такім людзям у спецыяльных камендатурах, ці па жаргоннаму выразу — на "хіміі".

"Сядзяць" тут у пераважнай большасці "аварыйшчыкі". "Сядзяць", зразумела, гэта перабольшанне. Бо сустрэць умоўна асуджаных за дарожна-транспартныя здарэнні кожны дзень можна ў горадзе. Ранічкай яны едуць на працу ў будаўнічы трэст N4, днём ходзяць у сталоўку, вечарам наведваюць кінатэатры. Больш таго, пры ўмове выканання ўсіх патрабаванняў праз 11 месяцаў ідуць у чарговы адпачынак.

Але ж і гэта не ўсё. Яны атрымліваюць за сваю працу неблагія грошы — ад 200 да 600 тысяч рублёў у месяц. Прылежных у паводзінах часцяком адпраўляюць дадому. То дапамагчы ўраджай убраць, то дроў нарыхтаваць, то па іншай якой прычыне.

— Дык гэта не турма, а курорт нейкі, — адрэагаваў на расповед пра "хімію" немалады ўжо мой сусед.

— О, каб яно так, — аж падскочылі з месцаў хлопцы са спецкамендатуры, калі я пераказаў ім рэакцыю суседа, — тут таксама не мёд.

Выпіў добра — глядзіш, атрымаў "граніцу" — месяц нявыхаду ў горад у вольны ад работы час. Выпіў меней — пяць нарадаў на гаспадарчыя работы.

Тры-чатыры разы папаўся на Бахусе — пастаноўка на ўлік у наркалагічны дыспансер.

За сістэматычныя і злосныя парушэнні рэжыму ўтрымання можна "адхапіць" тэрмін у калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Нікому не спадабаецца і тая акалічнасць, што тры разы на дзень трэба прайсці праверку, нямала гадзін у тыдзень правесці ў нарадах, адчуваць, што праз дзвярное акенца за табой у любы момант "пасочыць" "гражданин начальник".

— Што ж вы хацелі? — адрэагаваў на мае сумненні начальнік спецкамендатуры N 2 Анатоль Ляшко. — Як-ніяк наша ўстанова ўсё-такі рэжымная, і знаходзяцца тут людзі, якія парушылі закон. За гэта трэба несці нейкую адказнасць? Трэба. Калі б не было тых абмежаванняў, што існуюць, ведаеце, што рабілася б. Пад пільным наглядам, і то зрываюцца.

Тут самы час расказаць вось пра што.

У спецкамендатуры N 2 за 11 месяцаў 1994 года па ўліку прайшло 296 чалавек, з якіх 113 навічкоў. 34 чалавекі за ўзорную працу і паводзіны адпраўлены датэрмінова "па палавінцы" дадому. Пятнаццаць жа за сістэматычныя парушэнні рэжыму накіраваны ў месцы пазбаўлення волі. Гэта, заўважце, у лепшай установе падобнага тыпу Міністэрства ўнутраных спраў.

Спецкамендатур у нашай дзяржаве 48, на 7 тысяч месцаў. За год праз іх праходзіць каля 12 тысяч чалавек. Можаце ўявіць сабе такую "армію". Дык вось там надараюцца самыя што ні на ёсць турэмныя звычаі і "законы". Сустракаюцца і вымагальнікі, і рэкеціры, не кажучы ўжо пра турэмны жаргон.

І ўсё роўна для дзяржавы больш выгадна мець спецкамендатуру, чым калонію. У апошні год утрымання аднаго асуджанага абыходзіцца прыкладна 1 мільён рублёў. На "хіміі" кожны "кліент" працуе на сябе. За месца ў інтэрнаце плаціць недзе за трыццаць тысяч, вопратку і абутак купляе сам, есці варыць сабе сам, хаця і на агульнай кухні. Самая ж галоўная прывілея "хімікаў" тая, што пасля адбыцця тэрміну пакарання яны не лічацца асуджанымі. Застаюцца з "чыстай" біяграфіяй.

Можа, таму многія (у 1994 годзе ажно 8 чалавек) пасля заканчэння ўмоўнага тэрміну застаюцца працаваць у трэсце. Ім выдзяляецца ўжо звычайны інтэрнат, становяцца хлопцы ў чаргу на кватэру. А чаго ехаць у глухую вёсачку (у спецкамендатуры N 2 у асноўным хлопцы з сельскай мясцовасці), калі гарадское жыццё больш рэгламентаванае, прывабнае і грашовае.

І апошняе пра спецкамендатуру N 2.

Нядаўна адміністрацыя гэтай установы арганізавала сустрэчу ўмоўна асуджаных з роднымі. Разаслалі пісьмы з запрашэннямі амаль 70 працэнтам бацькоў ці сем'ям "хімікаў". Размовы па душах, сумесная экскурсія па Мінску, вольныя прагулкі, канцэрты — хай сабе і не лепшая праграма дня, але першая ў рэспубліцы. Без перабольшання скажу: асуджаным і родным яна спадабалася.

Але лепш за такімі мерапрыемствамі назіраць збоку — з волі.

Лепшы выйграны бой — вучэбны. Лепшы працаўнік — умоўны

Сяргей ГРЫЦ, фота аўтара

Прыказцы, якая сцвярджае, што салдатамі не нараджаюцца, а імі становяцца, цяжка не паверыць, але ўсё ж гэтыя маладыя хлопцы на цэнтральным прызыўным пункце горада Мінска нечым напамінаюць нованароджаных жаўтаротых птушанят, якія пасталеюць і ўзмужнеюць толькі пасля цяжкай працы. Яны стануць салдатамі, наглытаўшыся салёнага поту, нажыўшы мазалі, і дзякуй Богу, што гэтыя беларускія хлопцы такую навуку — станавіцца салдатам — будуць спасцігаць на палігонах пад Барысавам, Асіповічамі ці Мар'інай Горкай, а не на вуліцах чужой сталіцы пад прыцэламі на ўсё гатовых падлеткаў-гранатамётчыкаў. Хай наша незалежнасць бароніць бацькоўскія сэрцы і будучае ўсяе нацыі ад жахаў далёкай вайны.

Надежная крыша для таможни

Первая благоустроенная таможня торжественно открылась в Браславском районе.

Капитальное здание, возведенное по спецпроекту, предоставляет максимум удобств для тех, кто призван "мытарить" проезжающих через белорусско-латвийскую границу.

Правда, местным жителям от новостройки пока особой пользы нет. В то время как их родственники, живущие в Латвии, но не удостоенные ее гражданства, свободно пересекают границу Беларуси, нашим соотечественникам для посещения латвийских свояков надо выкладывать по 10 долларов за визу, которую можно получить только в Минске или Витебске. Впрочем, браславчане все-таки надеются, что с открытием таможни в деревне Урбаны выездные документы будут выдаваться прямо здесь.

Степан СТАРОЖИЛ.

КРЫМІНАЛЬНЫ СЮЖЭТ

Крышталь ад Караля

Іван СІНЯЧОЎСКІ

Быў час, калі мы любілі купляць крышталёвы посуд і піць з мудрагелістых ззяючых кілішкаў. Цяпер на гэта мала ў каго стае грошай. І таму дырэктар Барысаўскага крышталёвага завода А.С.Кароль скіраваў свой позірк за мяжу, дзе, як вядома, людзі жывуць значна заможней.

Як і заведзена ў нашай бесталковай эканоміцы, самі прадпрыемствы чамусьці рэдка выходзяць на прамую сувязь з пакупнікамі. Усё больш праз пасрэднікаў. Ну, а тыя, зразумела, толькі за кошт перапродажу і жывуць, да таго ж зусім нядрэнна. Барысаўчане выбралі сабе ў партнёры-пасрэднікі канцэрн "Камінвест". Адгрузіўшы прадукцыі амаль на 50 тысяч долараў ЗША англічанам з нейкага "Розна энд Ко", завадчане атрымалі толькі палову належнай аплаты. Ва ўсякім разе, такое было на момант праверкі Кантрольнай палатай Рэспублікі Беларусь.

Гэтак жа ўдала "нагрэлі" беларусаў маскоўская фірма "Будматэрыялзамежгандаль" і іарданскія камерсанты з прадпрыемства пад рамантычнай назвай "1001 ноч". Усяго на 1 кастрычніка 1994 года Барысаўскі крышталёвы завод недаатрымаў 49 612 долараў ЗША. Адпаведна ў дзяржаўны бюджэт не паступілі падатак з валютнай выручкі і доля абавязковага продажу дзяржаве ў памеры 20 працэнтаў.

Можа, калі-небудзь гэтыя долары барысаўчане і атрымаюць. А вось з расійскімі рублямі сітуацыя значна складанейшая.

У жніўні 1994 года намеснік дырэктара завода І.У.Ігнатовіч па факсе заключыў дагавор з таварыствам з абмежаванай адказнасцю "Арыён" з Краснаярска на пастаўку прадукцыі. Як спадар Ігнатовіч даведаўся, што ёсць недзе ў Сібіры такі "Арыён", застаецца камерцыйнай тайнай. Не менш дзіўна і тое, што велізарныя каштоўнасці насуперак усім правілам проста так перадаваліся ў рукі людзям, пра якіх не толькі нічога не ведалі, але і ў вочы іх не бачылі.

Крышталь рушыў у Расію, а завод зноў жа па факсе атрымаў копіі плацежных даручэнняў, з якіх вынікала, што "Арыён" заплаціў акцыянернаму прадпрыемству "Газпрам" у Маскве 193 мільёны расійскіх рублёў, і цяпер на гэтыя грошы газ з Расіі пойдзе на Барысаўскі завод.

Газ не пайшоў. Грошы не вярнуліся таксама. А крышталь у Кастраме хтосьці атрымаў, пагрузіў "на неўстаноўлены транспарт і вывез у невядомым напрамку". Як выявіла праверка, фірмы "Арыён" па ўказанаму юрыдычнаму адрасу няма. Больш таго, яна наогул не зарэгістравана ў Краснаярску. Плакаў беларускі крышталь, але не плакалі кіраўнікі завода. Нават чамусьці асабліва не клапаціліся, каб вярнуць страты. Чаму? Пытанне пытанняў... Хутчэй за ўсё для следчых органаў.

Гэта, скажам прама, надзвычайнае здарэнне нічому не навучыла кіраўнікоў прадпрыемства. І яны зноў без папярэдняй аплаты адпраўляюць расійскім фірмам "Аўгуст", "Аляксандра", "Юліс" сваю прадукцыю амаль на 226 мільёнаў расійскіх рублёў. На 1 верасня 1994 года ўсходнія суседзі запазычыліся заводу амаль 400 мільёнаў рублёў. Застаецца толькі гадаць — вернуць іх прадпрыемству, папярэдне "пакруціўшы" з гадок, ці так яны і асядуць назаўсёды ў кішэнях расійскіх бізнесменаў, якіх так невытлумачальна палюбілі кіруючыя барысаўскія крышталяробы.

Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь мяркуе атрымаць адказ на гэтыя пытанні да 1 красавіка 1995 года.

Поучитесь у них

Политики воздвигают границы, книгоиздатели — раздвигают их

Библиотечку из нескольких сотен книг подарило белорусскому посольству в Вильнюсе минское издательство "ИнтерДайджест". Посол нашей республики в Литве, бывший министр культуры Беларуси В.К.Войтович выразил сердечную благодарность землякам.

Эта новогодняя благотворительная акция продолжила добрую традицию, заведенную "ИнтерДайджестом" с самых истоков его существования. Едва встав на ноги, молодое коммерческое издательство стало направлять часть своих доходов на благотворительные цели. В рамках этой программы были выделены значительные средства Обществу белорусского языка, республиканскому Литфонду, Ассоциации пострадавших от чернобыльской аварии, различным городским службам, обеспечивающим жизнедеятельность белорусской столицы. Издательство взяло на себя расходы по благоустройству одной из городских улиц в районе Шабаны, выделило средства на лечение в московской клинике профессора-окулиста Святослава Федорова известному белорусскому писателю Виктору Карамазову. Материальная поддержка оказана "ИнтерДайджестом" и семье безвременно погибшей белорусской поэтессы Евгении Янищиц.

Но все-таки основное содержание благотворительных акций издательства напрямую связано с его фирменной продукцией — книгами. Комплекты красочных изданий "ИнтерДайджеста" получили в связи с недавним юбилеем университетского факультета журналистики его старейшие преподаватели. Библиотечку белорусской и переводной литературы издательство скомплектовало для германского посольства в Минске; такие же подарки, вероятно, получат и другие иностранные представительства в белорусской столице. Смысл этого акта станет понятен каждому, кто бросит взгляд на обложки книг, выпущенных "ИнтерДайджестом": большинство из них — произведения зарубежных авторов, впервые представленные нашему читателю.

